**УДК 821.161.3'06-14:177.81**

***А. В. Анцімонік***

# ФЕНОМЕН КАХАННЯ ЯК ЭКЗІСТЭНЦЫЙНАЯ ПРАБЛЕМА Ў ЛІРЫЦЫ СУЧАСНЫХ ПАЭТАЎ СТАРЭЙШАГА ПАКАЛЕННЯ

*Артыкул прысвечаны спецыфіцы рэалізацыі феномена кахання як экзістэнцыйнай праблемы ў творчасці сучасных паэтаў старэйшага пакалення. На аснове вершаў Я. Сіпакова, Р. Баравіковай, А. Вярцінскага, Н. Мацяш, А. Разанава, Г. Каржанеўскай робяцца высновы аб выключнай важнасці любові ў аксіялагічнай сістэме творчага пакалення, цеснай знітаванасці кахання з праблемамі сэнсу чалавечага жыцця, пераадолення абсурду існавання і пакутлівага перажывання асобай сваёй экзістэнцыі.*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Калі разглядаць каханне як экзістэнцыйную, а не інтымную праблему, то першаступенную важнасць набывае асэнсаванне яе ў сувязі з такімі з’явамі, як смерць, спасціжэнне ўласнага “Я”, пошук сэнсу жыцця, пакута, самота, роспач і пад. Сучасныя беларускія паэты старэйшага пакалення (вылучана на падставе ідэі размежавання паэтычных генерацый, прапанаванай А. Бельскім у “Гісторыі беларускай літаратуры XX стагоддзя” [Гл.: 1, с. 45–46]) – Алесь Разанаў, Раіса Баравікова, Янка Сіпакоў, Ніна Мацяш, Анатоль Вярцінскі і Галіна Каржанеўская – надаюць вялікую ўвагу ў сваёй творчасці феномену кахання. Нягледзячы на тое, што згаданыя аўтары адносяцца да самага традыцыйнага ў эстэтычных арыентацыях пакалення, менавіта яны першымі зазналі зрухі ў закансерваванай літаратуры савецкай эпохі і сталі ў пэўным сэнсе першапраходцамі (маюцца на ўвазе эвалюцыя паэтычнай свядомасці, жанрава-стылёвыя змены, новыя творчыя метады і эстэтычныя прынцыпы). Любоў займае адно з цэнтральных месцаў у мастацкай аксіялогіі аўтараў, кожным з якіх унікальнае інтымнае пачуццё асэнсоўваецца суб’ектыўна, аднак пэўныя пэўныя агульныя адметнасці вырашэння гэтай экзістэнцыйнай праблемы відавочныя.

Часта каханне – як правіла, шчаслівае і ўзаемнае – становіцца той сілай, якая дапамагае лірычным героям пераадолець балансаванне ўласнай экзістэнцыі паміж уладкаванасцю і неўладкаванасцю жыцця, упэўненасцю і няўпэўненасцю ў сабе і свеце. Напрыклад, герой верша Я. Сіпакова “Каханне” перакананы, што толькі чалавек, які ўмее кахаць, варты таго, каб жыць. Каханне прадстае тут ірацыянальным феноменам, што, як бы парадаксальна гэта ні гучала, здольнае згубіць чалавека для таго, каб той зведаў сапраўднае жыццё: “Бо толькі так і можна жыць на свеце: / Згарэўшы ўшчэнт, застацца зноўку жыць” [2, с. 225]. Аднак падобнае ўяўленне пра знітаванасць Эрасу (“інстынкту жыцця”) і Танатасу (“інстынкту смерці”), што рэпрэзентуе сітуацыю суаднесенасці кахання са знішчэннем, не мае супярэчлівага характару. Гэтая карэляцыя была вытлумачана яшчэ З. Фрэйдам: “<…> агрэсіўныя імкненні ніколі не існуюць самі па сабе, але заўсёды спалучаны з эратычнымі” [3, с. 114]. Падобная тэндэнцыяназіраецца ў вершах А. Вярцінскага. На мяжы тысячагоддзяў паэт амаль не звяртаўся да тэмы любові, аднак у ранейшай творчасці імкнуўся да выяўлення найперш псіхалагічнага стану закаханага чалавека. Медытатыўна-рэфлексіўны пачатак ярка праяўляецца ў вершы “Эдзіт Піяф хоча любві”, дзе каханне набывае танатычнае гучанне і разбуральную семантыку: “І так заўсёды – дзе любоў, / там: катастрофа” [4, с. 87]. Але ў цэлым у А. Вярцінскага пераважае лірыка, у якой каханне выяўляецца праз вобразы, процілеглыя смерці, – шчасце, пяшчоту, волю, надзею, святло, вечнасць (вершы “Эдзіт Піяф хоча любві”, “Твая воля – як воля лёсу…”, “Хто ў лес, а хто па дровы…”, “Ратунак”, “Мне ўяўляецца гэта так…”, “Адна з прыкмет закаханасці” і інш.).

Як правіла, глыбокія інтымныя пачуцці ў лірыцы паэтаў старэйшага пакалення становяцца сэнсаўтваральнай асновай быцця чалавека. І. Штэйнер, аналізуючы паэзію Р. Баравіковай, заўважае: “Адзіны сродак вяртання ў былы Эдэм, адзіны ратунак ад сусветных Самоты, Суму, Тугі, Расчаравання, адзіныя надзея і збавенне з цянётаў надзённасці і марнасці быцця – велічнае КАХАННЕ” [5, с. 9]. Гэтыя словы справядлівыя ў адносінах да іншых паэтаў.

Цесная знітаванасць матываў кахання і прызначэння чалавечага быцця выяўляецца ў творчасці Н. Мацяш. Па словах Т. Матусевіч, “асаблівасць любоўнай лірыкі паэткі ў тым, што кожны яе верш спалучае хараство і глыбокі роздум пра сэнс існавання” [6, с. 19]. Выразнае пацверджанне такому тэзісу знаходзім у вершы “Ластаўка”: “адно любоўю можна стому, / жыццё і скон свой апраўдаць” [7, с. 257]. Падобнае меркаванне ў дачыненні да лірыкі Р. Баравіковай выказвае і А. Брадзіхіна: “І ў рускай [Г. Ахматавай. – А. А.], і ў беларускай паэтак разуменне месца кахання ў сістэме каштоўнасцей і яго ролі ў жыцці супадае амаль цалкам: жыццё без кахання не можа быць паўнацэнным” [8, с. 209]. З. Падліпская таксама выказвае блізкую думку: “Каханне робіць чалавека

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

дужым, яно расплюшчвае яго вочы на многія з'явы: "*Якія вочы мне дало каханне!*". Прыходзіць разуменне, што жыццё без кахання не мае сэнсу" [9, с. 12].

Каханне нават здольнае пазбавіць асобу ад пакутлівага перажывання сваёй экзістэнцыі: "Рашуча ўсе сумненні адхіні – / Няма адчаю, калі так кахаеш!" (верш Я. Сіпакова "Травой траву ніколі не стрымаеш…") [2, с. 253]. Яно мае неадольную сілу пераканання асобы ў вартасці жыцця: "Каханне – шчасце і працяг быцця" (верш Р. Баравіковай "Сарамлівасць юнай") [10]. Яно дапамагае чалавеку і падтрымлівае яго не толькі ў крызісныя моманты спасціжэння рэчаіснасці і ўласнага "Я", але і ў штодзённай мітусні: "Не азірайся / анідзе – / з табой я ўсюды (верш А. Разанава "Нявыказаная балада") [11, с. 35].

Сваё выратаванне ад абсурду існавання лірычная гераіня Н. Мацяш бачыць у паяднанні душ (вершы "Мой муж, мой вечны падарожнік…", "Строма", "Збыліся"). Больш за тое, яна верыць, што менавіта праз каханне магчыма спазнаць сябе як мага глыбей, здзейсніцца. Такія спробы заглыблення ў сутнасць феномена кахання спрыяюць прыняццю асобай ідэі канечнасці чалавечага існавання, дазваляюць ёй прымірыцца з непазбежнасцю смерці: "Два целы возьме смерць, а мусіць / Здаволіцца душой адною" (верш "Мой муж, мой вечны падарожнік") [7, с. 185]. Жаданне жыць у любы момант можа знікнуць, і толькі каханне заўсёды ратуе чалавека: "Жыццё стамляе, МАМА // Не стамляе і не стамляецца адна любоў" (верш "Берагіня") [7, с. 260].

Нягледзячы на тое, што феномен кахання як сэнсаўтваральная аснова быцця займае важнае месца ў творчасці паэтаў старэйшага пакалення, ён нярэдка ўвасабляецца праз экзістэнцыйныя матывы пакуты, расчаравання, роспачы, самоты. Асабліва выразна такая тэндэнцыя прасочваецца ў лірыцы Р. Баравіковай. Лірычная гераіня паэткі зведала і безумоўнае сапраўднае шчасце, і балючы адчай, якія могуць праявіць сябе як наступствы кахання (адначасова ці паслядоўна). У горычы ёю прамаўляюцца словы адмаўлення ад любові: "Прымроіцца, як ясны дзень, каханне, / цьфу на яго! Яно заўжды чума" (верш "За дзень да снежня") [10]. Часам на першы план выступаюць нават здзекліва-саркастычныя і, разам з тым, роспачныя роздумы:

Твар успыхне, як колісь, знянацку
пры сустрэчы – дзівацтве быцця...
Ах, якую свет страціў бы цацку
без любоўнага пачуцця! [10]
("Верш без назвы")

Аднак нават у стане адзіноты і скаронасці перад нешчаслівым каханнем лірычная гераіня Р. Баравіковай трымаецца за ўласнае пачуццё прывязанасці, бачачы ў ім пэўнае выратаванне. Тут варта прывесці словы В. Шынкарэнкі: "Здаецца, што гады ростаняў яшчэ больш умацавалі ў гераіні пачуццё ўдзячнасці лёсу і любаму за дараваныя каханне і слёзы, што ў нейкі момант раптам здольныя выбухнуць рэдкім і дарагім натхненнем. Менавіта ўсёпаглынальны агонь самаахвярнага кахання, праменнасць яго святла, што прагне неўміручасці і спасціжэння вечнасці, выступае ці не цэнтральным матывам усіх лірычных кніг Р. Баравіковай" [12, с. 249]. Расстанне з каханым хоць і выклікае крызіс у душы жанчыны, аднак яна не гатовая здацца, адмовіцца ад жыцця і яго радасцяў толькі з-за немагчымасці ўзаемнага кахання.

Няўпэўненасць у жыватворных мажлівасцях кахання заўважаецца ў вершах канца 80-х–90-х гадоў мінулага стагоддзя Н. Мацяш. На думку В. Смаля, "адчувальным становіцца ўнутраны парыў паэтычнай асобы Н. Мацяш да новых ступеняў быційнай гармоніі. Яна не хоча вярэдзіць адбалелае, наноў перажыць самазабвёнае каханне, якое можа стаць душэўнай драмай і пакутай у тым ліку і для выбранніка: І голас твой не ўзварушы, // І твой прыезд амаль не ўзрушыў. Такія «выгасанне», «выстыласць» сардэчнага пачуцця палохалі лірычную гераіню, пакідалі адчуванне душэўнай пустаты, знямогласці, нездольнасці па-ранейшаму самааддана тужыць і радавацца каханню"

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

[13, с. 135]. Да таго ж, жанчына ў паэзіі аўтаркі сумняваецца, ці сапраўды душы каханых застаюцца разам пасля фізічнай смерці:

Ці хопіць нашага святла,
Каб і на сцежцы незямной
Нам стрэча дадзена была? [7, с. 205]
(“Не ведаю”)

Сумненні ў неаспрэчнай вартасці інтымных пачуццяў узнікаюць і ў лірычнай гераіні Г. Каржанеўскай. Каханне ў яе ўяўленні не здольнае прымірыць асобу з кожнадзённым існаваннем:

Нашто бяда, нашто любоў,
Нашто нявер’е без прасвету
Ў сябе дапытваюся зноў:
Нашто юдоль зямная гэта? [14]
(“Нашто?”)

Да таго ж, згодна з меркаваннем лірычнай гераіні, любоўнае пачуццё само па сабе першапачаткова нясе згубу, таму што: “пачынаецца з болю каханне, / З болю, што не пракаўтнуць” (верш “Вася-Васечка”) [15, с. 13].

Такім чынам, каханне займае адно з цэнтральнае месца ў сістэме мастацкай аксіялогіі старэйшага пакалення беларускіх паэтаў, што пацвярджае выключную актуальнасць і значнасць гэтага феномена ў жыцці чалавека. Спецыфіка вырашэння дадзенай экзістэнцыйнай праблемы старэйшым пакаленнем сучасных паэтаў вынікае з эратычна-танатычнай прыроды любові. У выпадку шчаслівага і ўзаемнага кахання лірычных герояў глыбокае інтымнае пачуццё паўстае сілай, якая дапамагае пераадолець неўладкаванасць уласнай экзістэнцыі, надае сэнс чалавечаму быццю і дапамагае спасцігнуць сваё сапраўднае “Я” (Я. Сіпакоў, А. Вярцінскі, Н. Мацяш, Р. Баравікова, А. Разанаў). Калі ж любоўныя перажыванні не знаходзяць водгуку ад аб’екта закаханасці, то яны нясуць з сабой горыч, адзіноту, пакуты і дадаюць экзістэнцыйнага жаху чалавечаму існаванню (Н. Мацяш, Р. Баравікова, Г. Каржанеўская). Як бачым, і ў зместавым, і ў фармальным плане каханне як экзістэнцыйная праблема вырашаецца ў лірыцы паэтаў старэйшага пакалення даволі традыцыйна.

**Літаратура**


1 Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя: у 4 т. / навук рэд. У. В. Гніламёдаў, С. С. Лаўшук. НАН Беларусі, Аддз-не гуманітар. навук і мастацтваў, Ін-т літ. імя Я. Купалы. – Мінск: Бел. навука, 2003. – Т. 4. Кн. 2. 1986–2000. – 975 с.

2 Сіпакоў, Я. Выбраны творы: у 2 т. / Я. Сіпакоў. – Мінск: Маст.літ., 1995. – Т. 1. – Паэзія. – 431 с.

3 Фрейд, З. Влечения и их судьба / З. Фрейд; пер. М. В. Вульф, Р. Ф. Додельцев. – М. : ЗАО Изд-во ЭКСМО-Пресс, 1999. – 432 с.

4 Вярцінскі, А. Выбранае / А. Вярцінскі. – Мінск : Маст. літ, 1973. – 144 с.

5 Штэйнер, І. Самотная ў капелюшы на фоне саду / І. Штэйнер // Баравікова, Р. Дрэва для райскай птушкі: лірыка / Р. Баравікова. – Мінск : Маст. літ., 2007. – С. 5–12.

6 Матусевіч, Т. “Той час прасякнуты табою…”: Лірыка кахання Ніны Мацяш / Т. Матусевіч // Роднае слова. – 2005. – № 9. – С. 17–19.

7 Мацяш, Н. Выбраныя творы / Н. Мацяш. – Мінск : Беларуская навука, 2015. – 604 с.

8 Брадзіхіна, А. Пераемнасць традыцый / А. Брадзіхіна // Полымя. – 2003. – № 1. – С. 202–214.

9 Падліпская, З. “Яно і нараканне, і сонца, і пякучай цемры сплаў”: Духоўны свет лірычнай гераіні Раісы Баравіковай / З. Падліпская // Роднае слова. – 2006. – №3. – С. 11–13.

10 Баравікова, Р. Сад на капялюшыку каханай : лірыка [Электронны рэсурс] / Р. Баравікова. – Рэжым доступу: http://kamunikat.org/usie_ knihi.html?pubid=22654. – Дата доступу: 23.03.2017.


РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

11 Разанаў, А. Танец з вужакамі: выбранае / А. Разанаў. – Мінск : Маст. літ., 1999. – 462 с.

12 Шынкарэнка, В. Слухаць сэрцам / В. Шынкарэнка // Полымя. – 2002. – № 3–4. – С. 239–258.

13 Смаль, В. Паэтычна-экзістэнцыйны свет Ніны Мацяш / В. Смаль // Białorutenistyka Białostocka. – 2013. – Т. 5. – С. 123–144.

14 Каржанеўская, Г. Вершаняты : паэтычныя мініяцюры [Электронны рэсурс] / Г. Каржанеўская. – Рэжым доступу: http://kamunikat.org/usie_knihi.html?pubid=18013. – Дата доступу: 23.03.2017.

15 Каржанеўская, Г. Я табе напішу…: Песні / Г. Каржанеўская, М. Яцкоў. – Брылі : Справа, 2013. – 26 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ